# АСАБЛІВАСЦІ НАВУЧАННЯ МАЛОДШЫХ ШКОЛЬНІКАЎ МАЎЛЕНЧАМУ ЭТЫКЕТУ НА ЎРОКАХ РОДНАЙ МОВЫ

***Н.Л. Ступакова*** *(УА МДПУ імя І.П. Шамякіна)*
Навуковы кіраўнік – А.В. Солахаў, канд. філал. навук, дацэнт

Важнейшай сацыяльнай характарыстыкай асобы з'яўляецца высокая культура ўзаемаадносін паміж людзьмі. Для фарміравання яе вялікае значэнне мае навучанне ў малодшым школьным узросце маўленчаму этыкету.

У падручніках па беларускай мове змяшчаюцца асобныя практыкаванні, звязаныя з фарміраваннем у вучняў маўленчага этыкету, праграмай для школ з беларускай мовай навучання нават прадугледжаны асобныя урокі па маўленчым этыкеце ў 2-м класе. Аднак такі падыход – з’ява хутчэй эпізадычная, таму што ўрокі маўленчага этыкету праводзяцца рэдка, а заданні, звязаныя з маўленчым этыкетам, даюцца таксама не часта. Для засваення ж формул маўленчага этыкету, на нашу думку, важна арганізаваць сістэматычны зварот да іх на ўроках роднай мовы. Гэтаму могуць дапамагчы спецыяльныя памяткі, напрыклад:

| **Вітанні** | Развітанні |
|---|---|
| Добрай раніцы! | Да пабачэння! |
| Добрага ранку! | Бывайце здаровы! |
| Добры дзень! | Да спаткання! |
| Добрага дня вам! | Да (хуткай, новай) сустрэчы! |
| Добры вечар! | Да новага спаткання! |
| Добрага вечара! | Усяго найлепшага! |
| Добрага здароўя! | Усяго добрага! |
| Вітаю (цябе)! | Шчаслівай дарогі! |

Пачатак заняткаў у школе павінен пачынацца не толькі з вітання настаўніка. Настаўніку варта прапанаваць гэта зрабіць і вучням:

– Добрага ранку! Хачу, каб вы падарылі адзін аднаму ўсмешку-сонейка і громка пажадалі добрага дня.

У канцы заняткаў настаўнік можа прапанаваць:

– Усяго вам найлепшага! Я таксама хачу пачуць, што вы пажадаеце на развітанне адзін аднаму?

Для правядзення маўленчых і арфаграфічных размінак неабходна часцей выкарыстоўваць разнастайны матэрыл, які ўключае формулы маўленчага этыкету:

1) прыказкі тыпу *Шануй людзей, то і цябе пашануюць*;

2) языкаломкі: *Пад вечар і ўвечар кажы «Добры вечар!», а нанач: «Дабранач!»* (А. Клышка);

3) кароткія вершы, напрыклад: «Пакланіся добрым людзям» У. Паўлава, «Дарагая мамачка» Л. Пранчака, «Чатыры пажаданні» В. Віткі і інш.

Толькі прадуманая сістэматычная праца па навучанні маўленчаму этыкету можа даць плён. І залежыць яна ад настаўніка.

МГПУ им. И.П. Шамякина